# *19–0. Культура Беларусі ў IX–XIII стст.

**1. Летапісанне.** Неацэннымі крыніцамі нашых ведаў пра мінулае з'яўляюцца летапісы. На тэрыторыі Усходняй Еўропы яны складаліся з X да XIX ст. Падобныя творы былі ва ўсіх еўрапейскіх народаў. У Заходняй Еўропе, напрыклад, яны называліся аналы (лац. annales — гадавыя зводкі), а таксама хронікі (грэч. chronika — адносіцца да часу); хронікі адрозніваліся ад аналаў больш падрабязным выкладаннем падзей.

1. Растлумачце, што такое летапісы.
2. Што значыць «увайсці ў аналы» або «застацца ў аналах»?
3. Якія цяжкасці выкарыстання летапісаў у якасці гістарычных крыніц? Якія метады выкарыстоўваюць вучоныя для пераадолення гэтых цяжкасцей?

Летапісы XII–XIII стст., створаныя на тэрыторыі Беларусі, не захаваліся. Вядома, што летапісанне вялося ў Навагародку, Пінску, Полацку. Час стварэння Полацкага летапісу, яго змест і аўтарства застаюцца невядомыя. Аднак выяўлена, што фрагмент гэтага летапісу захаваўся ў складзе Іпацьеўскага летапісу. Найбольш цікавы аповед, які датуецца 1158 г. і расказвае пра вяртанне ў Полацк выгнанага раней князя Рагвалода Барысавіча. З тэксту зразумела, што яго напісаў сведка падзей; гэта пацвярджаецца яскравымі дэталямі і выкарыстаннем жывой гаворкі той эпохі.

Гісторыя беларускіх зямель ад найстаражытнейшых часоў да XIV ст. досыць падрабязна асвятляецца ў Лаўрэнцьеўскім і Іпацьеўскім летапісах. Лаўрэнцьеўскі летапісны звод уключае ў сябе «Аповесць мінулых гадоў».

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### Аповесць мінулых гадоў

У год 6488. [ ]… І паслаў да Рагвалода ў Полацк сказаць: «Хачу дачку тваю ўзяць сабе ў жонкі». Той жа спытаў дачку сваю: «Ці хочаш за Уладзіміра?» Яна адказала: «Не хачу разуць рабыніна сына, але хачу за Яраполка». Той Рагвалод прыйшоў з-за мора і трымаў пасад свой у Полацку, а Тур трымаў пасад у Тураве, ад яго і празваліся тураўцы.

У год 6529. [ ]… Прыйшоў Брачыслаў, сын Ізяславаў, унук Уладзіміраў, на Ноўгарад, і ўзяў Ноўгарад, і, захапіўшы наўгародцаў і маёмасць іхнюю, пайшоў да Полацка зноў. І калі прыйшоў ён да ракі Судоміры, і Яраслаў з Кіева на сёмы дзень нагнаў яго тут. І перамог Яраслаў Брачыслава, і наўгародцаў вярнуў у Ноўгарад, а Брачыслаў збег да Полацка.

У год 6552. [ ]… У той жа год памёр Брачыслаў, сын Ізяславаў, унук Уладзіміраў, бацька Усяславаў, і Усяслаў, сын ягоны, сеў на [княжацкім] стале ягоным [у Полацку], маці ж нарадзіла яго ад валхвавання. Калі маці нарадзіла яго, на галаве ягонай аказалася язва, і сказалі валхвы маці ягонай: «Гэтую язву навяжы на яго, хай носіць яе да смерці». І носіць яе на сабе Усяслаў і да гэтага дня; таму і не літасцівы на кровапраліцце.

У год 6575. [ ]… Узняў раць у Полацку Усяслаў, сын Брачыслава, і заняў Ноўгарад. Трое ж Яраславічы, Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, сабраўшы вояў, пайшлі на Усяслава ў моцны мароз. І падышлі да Менска, і менчукі замкнуліся ў горадзе. Браты ж гэтыя ўзялі Менск і перабілі ўсіх мужоў, а жонак і дзяцей паланілі і пайшлі да Нямігі, і Усяслаў пайшоў супраць іх. І сустрэліся праціўнікі на Нямізе месяца сакавіка ў 3-і дзень; і снег быў вялікі, і пайшлі адны на адных. І была сеча жорсткая, і многія згінулі ў ёй, і адолелі Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, Усяслаў жа збег.

*1. Вызначце падзеі, пра якія апавядае летапіс (адзін абзац — адна падзея).*
*2. Укажыце даты гэтых падзей, якія неабходна ўпісаць у квадратныя дужкі.*
*3. Якое значэнне мае «Аповесць мінулых гадоў» для вывучэння гісторыі Беларусі?*